


| **REGULAMIN KONKURSU WYKONAWCÓW FESTIWALU BIAŁORUSKIEJ PIOSENKI BARDOWSKIEJ I AUTORSKIEJ „BARDAUSKAJA VOSIEŃ”** | **РЭГЛАМЕНТ КОНКУРСУ ВЫКАНАЎЦАЎ ФЕСТЫВАЛЮ БЕЛАРУСКАЙ БАРДАЎСКАЙ І АЎТАРСКАЙ ПЕСНІ «БАРДАЎСКАЯ ВОСЕНЬ»** |
|---|---|
| **1. POSTANOWIENIA OGÓLNE** | **1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ** |
| 1.1. XXX Festiwal Białoruskiej Piosenki Bardowskiej i Autorskiej **„Bardauskaja Vosień”** odbędzie się w dniach 24–25 października 2025 roku w Bielsku Podlaskim (woj. podlaskie, Polska). | 1.1. XXX Фестываль беларускай бардаўскай і аўтарскай песні **«Бардаўская восень»** адбудзецца 24-25 кастрычніка 2025 года ў г. Бельск Падляшскі (Падляшскае ваяводства, Польшча). |
| 1.2. Organizatorem Festiwalu jest **Fundacja Tutaka**. | 1.2. Арганізатарам Фестывалю выступае **Фонд Tutaka**. |
| 1.3. W związku z jubileuszową edycją Festiwalu Organizator ogłasza **Konkurs Wykonawców**. Konkurs to twórcza rywalizacja autorów/-ek–wykonawców/-czyń własnych piosenek w języku białoruskim, organizowana w celu wspierania i popularyzacji współczesnej białoruskiej piosenki bardowskiej i autorskiej, odkrywania nowych talentów i umożliwienia im występu na scenie Festiwalu. | 1.3. У сувязі з юбілейнай эдыцыяй Фестывалю Арганізатар абвяшчае **Конкурс выканаўцаў**. Конкурс — гэта творчае спаборніцтва аўтараў/-ак-выканаўцаў уласных песень на беларускай мове, якое праводзіцца з мэтай падтрымкі і папулярызацыі сучаснай беларускай бардаўскай і аўтарскай песні, адкрыцця новых імёнаў і прадастаўлення ім магчымасці выступіць на сцэне Фестывалю. |
| 1.4. **Formularz Zgłoszeniowy** to specjalny formularz online, którego wypełnienie jest jednoznaczne ze zgłoszeniem chęci udziału w Konkursie. Należy w nim podać dane osobowe i kontaktowe, krótki opis twórczości wykonawcy/zespołu oraz link do nagrania jednej autorskiej kompozycji w języku białoruskim. | 1.4. **Форма Заяўкі** — гэта адмысловая анлайн-форма, запаўняючы якую выканаўца заяўляе пра сваё жаданне прыняць удзел у Конкурсе. У форме пазначаюцца асабістыя і кантактныя дадзеныя, кароткая інфармацыя пра творчасць выканаўцы/калектыву, а таксама дадаецца спасылка на запіс адной уласнай кампазіцыі на беларускай мове. |
| **2. KRYTERIA KONKURSU** | **2. КРЫТЭРЫІ КОНКУРСУ** |

2.1. Do udziału w Konkursie zaproszeni są autorzy/-ki–wykonawcy/-czynie własnych piosenek.

2.2. Kandydat/-ka do udziału w Konkursie musi spełniać następujące kryteria:
- posiadać w repertuarze co najmniej 4 autorskie utwory w języku białoruskim,
- mieszkać w jednym z krajów Unii Europejskiej lub w innym kraju europejskim pod warunkiem posiadania ważnej na czas Festiwalu wizy uprawniającej do wjazdu na terytorium Rzeczypospolitej Polskiej. Organizator nie zapewnia wsparcia wizowego,
- w przypadku udziału zespołu liczba jego członków nie może przekraczać 4 osób.

2.1. Да ўдзелу ў Конкурсе запрашаюцца аўтары/-кі-выканаўцы ўласных песень.

2.2. Прэтэндэнт/-ка на ўдзел у Конкурсе павінны адпавядаць наступным крытэрыям:
- мець у рэпертуары не менш за 4 песні ўласнага сачынення на беларускай мове.
- пражываць у адной з краін Еўразвязу; або ў адной з іншых еўрапейскіх краін пры наяўнасці дзейснай на час правядзення Фестывалю візы, што дазваляе ўезд у Рэспубліку Польшча. Арганізатар не аказвае візавай падтрымкі.
- у выпадку ўдзелу ў складзе калектыву, колькасць яго ўдзельнікаў не павінна перавышаць 4 чалавекі.

## 3. WARUNKI UDZIAŁU W KONKURSIE

3.1. Aby wziąć udział w Konkursie należy:
- zapoznać się z niniejszym Regulaminem,
- do dnia **30 września 2025 roku** przesłać zgłoszenie oraz link do nagrania jednej autorskiej piosenki (YouTube) poprzez Formularz Zgłoszeniowy. Nagranie może mieć formę audio lub video, jakość profesjonalna nie jest wymagana,
- do Konkursu przyjmowane są wyłącznie autorskie utwory muzyczne w języku białoruskim do własnych tekstów lub tekstów białoruskich poetów,
- do dnia **30 września 2025 roku** opublikować w swoich mediach społecznościowych (Instagram lub Facebook) post dowolnej treści o zamiarze udziału w Konkursie z hashtagiem **#хачунаБардаўскуювосень** i obowiązkowym oznaczeniem Organizatora:
  Instagram: **@fundacja_tutaka**
  Facebook: **@FundacjaTutaka**
- w przypadku wygranej w Konkursie być gotowym/-ą do występu na scenie Festiwalu „Bardauskaja Vosień” w dniach 24 lub 25 października 2025 roku w Bielsku Podlaskim.

3.2. Niespełnienie któregokolwiek z wymagań powoduje niedopuszczenie kandydata/-ki do udziału w Konkursie.

## 3. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў КОНКУРСЕ

3.1. Для ўдзелу ў Конкурсе неабходна:
- азнаёміцца з дадзеным Рэгламентам;
- **да 30 верасня 2025 года** даслаць заяўку і спасылку на запіс адной уласнай песні (Youtube) праз Форму Заяўкі. Запіс можа быць як аўдыя, так і відэа, прафесійная якасць не абавязковая.
  Да Конкурсу прымаюцца выключна аўтарскія музычныя творы на беларускай мове на ўласныя вершы альбо вершы беларускіх паэтаў;
- **да 30 верасня 2025 года** выкласці ў сваіх сацыяльных сетках (Instagram альбо Facebook) пост адвольнай формы пра намер удзельнічаць у Конкурсе з хэштэгам **#хачунаБардаўскуювосень** і абавязковым тэгам арганізатара:
  Instagram: **@fundacja_tutaka**
  Facebook: **@FundacjaTutaka**
- у выпадку перамогі ў Конкурсе быць гатовымі выступіць на сцэне Фестывалю «Бардаўская восень» 24 або 25 кастрычніка 2025 года ў г. Бельск Падляшскі.

3.2. Пры невыкананні любога з патрабаванняў прэтэндэнт/-ка не дапускаюцца да ўдзелу ў Конкурсе.

| | |
|---|---|
| **4. PRZEBIEG KONKURSU** | **4. ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ** |
| 4.1. Informacja o zakwalifikowanych do Konkursu wykonawcach zostanie opublikowana przez Organizatora w mediach społecznościowych: Instagram, Facebook i Telegram. | 4.1. Інфармацыя пра адабраных да Конкурсу выканаўцаў будзе апублікаваная Арганізатарам праз сацыяльныя сеткі: Instagram, Facebook і Telegram. |
| 4.2. Konkurs odbędzie się online w formule otwartego głosowania w mediach społecznościowych Organizatora (Instagram, Facebook i Telegram). Organizator pozostawia sobie prawo do zmiany online platformy do przeprowadzenia głosowania, w zależności od ilości otrzymanych zgłoszeń. | 4.2. Конкурс адбудзецца анлайн у фармаце адкрытага галасавання ў сацыяльных сетках Арганізатара (Instagram, Facebook і Telegram). Арганізатар пакідае за сабой права змены анлайн-платформы для правядзення галасавання, у залежнасці ад колькасці атрыманых заявак. |
| 4.3. Do głosowania publiczności zostanie udostępniona playlista z utworami przesłanymi przez uczestników/-czki poprzez Formularz Zgłoszeniowy. | 4.3. Для галасавання аўдыторыі будзе прадстаўлены плэйліст з трэкаў, дасланых ўдзельнікамі/-цамі праз Форму Заяўкі. |
| 4.4. Zwycięzcą/-czynią zostanie uczestnik/-czka, który/-a uzyska największą liczbę głosów **łącznie we wszystkich mediach społecznościowych** Organizatora. | 4.4. Пераможцам/-ай стане ўдзельнік/-ца, што атрымае найбольшую колькасць галасоў **у суме па ўсіх сацыяльных сетках** Арганізатара. |
| 4.5. Głosowanie rozpocznie się **3 października 2025 roku** i potrwa do **9 października 2025 roku włącznie.** | 4.5. Галасаванне распачнецца **3 кастрычніка 2025 года** і працягнецца да **9 кастрычніка 2025 года ўключна**. Пераможца будзе абвешчаны **10 кастрычніка 2025 года** асобным пастом у сацсетках Арганізатара. |
| **5. NAGRODY** | **5. УЗНАГАРОДЫ** |
| 5.1. Zwycięzca/-czyni Konkursu otrzyma możliwość występu na Festiwalu **„Bardauskaja Vosień”**, który odbędzie się w dniach **24–25 października 2025** roku w Bielsku Podlaskim. | 5.1. Пераможца конкурсу атрымае магчымасць выступіць на фестывалі **«Бардаўская восень»**, які адбудзецца **24–25 кастрычніка 2025 года** ў г. Бельск Падляшскі. |
| 5.2. Zwycięzca/-czyni otrzyma honorarium w wysokości **2000 PLN brutto.** | 5.2. Пераможцу/-ы выплачваецца ганарар у памеры **2000 злотых брутта**. |
| 5.3. Organizator pokrywa koszty transportu, wyżywienia oraz zapewnia nocleg w razie potrzeby. | 5.3. Арганізатар аплачвае транспартныя выдаткі, харчаванне, а таксама забяспечвае начлег у выпадку неабходнасці. |
| **6. INFORMACJE DODATKOWE** | **6. ДАДАТКОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ** |
| 6.1. Udział w Konkursie oznacza zgodę uczestników/-czek na publikację materiałów foto-, audio- i wideo z ich udziałem w mediach społecznościowych Organizatora. | 6.1. Удзел у Конкурсе азначае згоду ўдзельнікаў/-ц на публікацыю фота-, аўдыя- і відэаматэрыялаў з іх удзелам у сацыяльных сетках Арганізатара. |

| | |
|---|---|
| 6.2. Zwracamy uwagę, że media społecznościowe Instagram, Telegram i TikTok Fundacji Tutaka są uznane za „materiały ekstremistyczne” na terytorium Białorusi. | 6.2. Звяртаем увагу, што сацыяльныя сеткі Instagram, Telegram i TikTok Фонду Tutaka прызнаныя «экстрэмісцкімі матэрыяламі» на тэрыторыі Беларусі. |
| **7. DANE KONTAKTOWE** | **7. КАНТАКТНЫЯ ДАДЗЕНЫЯ** |
| Wszelkie pytania dotyczące Konkursu można kierować:<br>● na adres e-mail: **konkurs@tutaka.org**<br>● poprzez profil na Facebooku: **@FundacjaTutaka**<br>● przez Telegram i Instagram Fundacji Tutaka. | Усе пытанні адносна конкурсу можна дасылаць:<br>● на электронную пошту: **konkurs@tutaka.org**<br>● праз профіль у Facebook: **@FundacjaTutaka**<br>● праз Telegram і Instagram Фонду Tutaka. |